# КЛАСІФІКАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ АСАБОВАЙ ЛЕКСІКІ З АДМОЎНАЙ КАНАТАЦЫЯЙ

**М. А. Чуканава**

Спецыяльнага даследавання, прысвечанага аналізу асабовай лексікі ў гістарычным плане да гэтага часу не было, хаця гэты лексічны пласт разглядалі ў сучаснай літаратурнай і дыялектнай беларускай мове (працы Крыўко М.Н., Панюціч К.М., Малдаван І.Ф., Губкінай А.В. і інш.).

У выніку тэматычнай класіфікацыі вылучаны семантычныя групы назваў асоб паводле разумовых здольнасцей, маўленчых паводзін, адносін да праўдзівасці, адмоўных рысаў характару, адносін да маральных нормаў і звычаяў (крыніцай фактычнага матэрыялу з'яўляецца [1]).

Назвы асобы паводле разумовых здольнасцей у адмоўным накірунку. Словы гэтай групы арыентаваны на выкрыццё невуцтва, адсталасці, бескультурнасці, недасведчанасці ў чым-небудзь. Тут мажліва вылучыць тры падгрупы, у залежнасці ад ступені "цяжкасці выпадка". Да такіх слоў можна аднесці:

1. Чалавек з нізкім інтэлектам; недасведчаны; неадукаваны:

- безрозумный (у знач. наз. дурань, вар'ят), безрозумникъ (наз. дурань), глупень, глупецъ, глупый (у знач. наз. дурань), дурень, кепъ; неразумный, нерозумный (у знач. неразумны чалавек).

2. Неразумны паводле ўчынкаў; неразважлівы; блазен:

- безрозумный (у знач. наз. дурань, вар'ят), безумница (безразважны чалавек), блюзнерца, блузнерца, блюзнирца (блюзнер), блюзнеръ (тое, што і блюзнерца), вила (дурань, блазен), дивакъ (дзівак), зблюзнерца (тое, што і блюзнерца).

3. Псіхічна хворыя; вар'яцкіх паводзінаў:

- бесноватый (у знач. наз. шалёны, вар'ят), бесный (тое, што і бесноватый), бешеный (у знач. наз. вар'ят), заплутаный, заплутанный.(у знач. наз. вар'ят).

У групе слоў, што характарызуюць асобу з пункту гледжання яе псіхічнага складу, разумовых здольнасцей, рыс характару, яркая пеяратыўная канатацыя найбольш шырока прадстаўлена ў назвах дурнаватага, недалёкага, някемлівага, бязглуздага чалавека.

У некаторых выпадках, асабліва ў словах 2-й і 3-й групы, актуалізуюцца семы "няяснасць, незразумеласць", "цемрашальства, зло":

Безумный, бэзумный прым. 1. Неразумны, безразважны.

2. У знач. наз. Неразумны, безразважны. птах ѡтлетѣвъ. а безумніи тощого гнезда стерегоутъ (Чэцця, 172б).

*Блюзнерца, блузнерца, блюзнирца* наз. Блюзнер. хꙋлникъ, вредѧй, и сквернѧй инагѡ славꙋ блюзнѣрца (Бяр., 188).

*Глупецъ* наз. Дурань. хто бы реклъ, глꙋпче, виненъ бꙋдет до геенны огнистои (Каліст, II, 307б).

Маўленчыя паводзіны асобы. Носьбітамі мовы асуджэнню падвяргаецца наяўнасць у маўленні асобы чаго-небудзь беззмястоўнага, шматслоўнасць, брыдкаслоўе, пахабнасць, пляткарства. Адмоўнай канатацыяй характарызуюцца словы-найменні балбатлівага, языкастага чалавека, пустаслова. Таксама ён не павінен пагражаць, быць насмешнікам, хвалько. Выдзяляюцца наступныя падгрупы:

- блюзнеры, брыдкасловы: блюзнерца, блузнерца, блюзнирца (блюзнер), блюзнеръ, злолаица (блюзнер; брыдкаслоў);
- пустазвоны: велемовца (пустазвон, пахабнік, пашляк), отрепичъ (перан. трапло, чалавек, які гаворыць лухту, бязглуздзіцу);
- пашлякі: велемовца (пустазвон, пахабнік, пашляк), поглумникъ (распуснік; той, хто насміхаецца, здзекуецца), поглумца (тое, што і поглумникъ);
- грубіяны: вырва (зласлівая, з’едлівая асоба), грубиянъ, грубеянъ (грубіян, непачцівы, недалікатны чалавек), дерзостникъ (дзёрскі чалавек, грубіян), лаятель (лаяльнік);
- насмешнікі: жартовливый (у знач. наз. жартаўнік), найгравачъ (той, хто глуміцца, насміхаецца, здзекуецца);
- хвалько: порожнохвалца (той, хто сам сабе дарэмна расхвальвае; хвалько); прожнохвалца (тое, што і порожнохвалца);
- пагражальнікі: похвальца, похвалца (той, хто пагражае).

Назвы асоб у адпаведнасці з іх адносінамі да праўдзівасці. Немагчыма не сказаць колькі слоў і пра ілгуноў, хлусаў – тых, хто паводзіць сябе няшчыра, падманвае іншых. Але няпраўда – гэта не плоская з’ява, а шматгранная. Каб добра размежаваць усе яе адценні, трэба разгледзець наступныя пытанні: хто кажа ману? каму? з якой мэтай? У залежнасці ад адказаў на вышэй пастаўленыя пытанні, вылучаем такія падгрупы, як:

- непасрэдна ілгуны (тыя, хто свядома маняць, каб не гаварыць праўды): льстивый, лстивый (у знач. наз. фальшывы, ілжывы чалавек), кривдумовный (прым. у знач. наз. ілжэц);
- паклёпнікі (узводзяць паклёп, хлусню на чалавека з мэтай яго прыніжэння): велемовца (каварны чалавек, паклёпнік), вадца (паклёпнік, нагаворшчык), дедчиця (зводніца, паклёпніца), заушникъ (паклёпнік, нагаворшчык, даносчык);
- льсціўцы, падлізнікі (падманваюць іншых пры дапамозе “прыемнай” хлусні з мэтай наблізіць іх да сябе і мець з гэтага выгоду): ласкатель (льсцівец, падлізнік), лестецъ, лестицъ (ліслівец), похлебникъ (ліслівец), похлебца (ліслівец, падлізнік);

- крывадушнікі (тыя, хто крывіць душой, гавораць не тое, што ў думках): лицемерникъ, лицемерныкъ (тое, што і лицемеръ), лицемерный (прым. у знач. наз. крывадушнік), двоесловница (двудушная, крывадушная жанчына), превротникъ (двудушны, каварны чалавек);
- ашуканцы (падманваюць і пры гэтым робяць злачынства – напрыклад, абкрадваюць): нугаксъ (ашуканец), облудникъ (крывадушнік; ашуканец; прытворшчык), облудный (у знач. наз. крывадушнік; ашуканец; адступнік);
- выдумшчыкі (фантазёры): вымышлячъ, вымыслячъ (выдумшчык), змышлячъ (прытворшчык, выдумшчык);
- прытворшчыкі (жадаюць здавацца тымі, кім насамрэч не з'яўляюцца): облудникъ (крывадушнік; ашуканец; прытворшчык), прикритца (прытворца), притворникъ (прытворшчык);
- няшчырыя: нещирый, нещырый ( у знач. наз. няшчыры чалавек).

Назвы асобы паводле іншых дрэнных рысаў характару. Да іх адносяцца:

1. Скупасць: видиричъ (вымагальнік, хцівец), жадникъ (убогі; прагнучы; скупы чалавек), жминдакъ (скупы чалавек, скнара), лихвяръ, лихваръ (ліхвяр), лихоимецъ (ліхвяр), мздоимець, мздоемець (той, хто любіць браць падарункі, хабарнік), посулница (хабарніца), резоемецъ (ліхвяр, хабарнік), скаредъ (скнара).
2. Зайздрасць: завидецъ (зайздроснік), зависникъ (зайздроснік, злоснік, вораг), заздросливецъ (зайздроснік), зазросливецъ (тое, што і заздросливецъ), зазросникъ, зазростникъ (зайздроснік), кананейчикъ (зайздроснік).
3. Зласлівасць, жорсткасць: барбаръ (тыран), братоненавидецъ (чалавек, які ненавідзіць бліжніх), братоненавистникъ (тое, што і братоненавидецъ), буй (буян), волкъ, вовкъ (перан. 'злы чалавек').
4. Баязлівасць: несмелый (у знач. наз. той, хто праяўляе адсутнасць смеласці).
5. Раўнівасць: ревникъ (раўнівы чалавек).
6. Самалюбства, ганарлівасць: высокомыслный, высокомысльный (у знач наз. ганарлівец), гордый (у знач. наз. ганарлівец), думца (ганарлівец, пышлівы чалавек), самолюбецъ (самалюб).
7. Агульныя назвы чалавека дрэннага па прыродзе: выродокъ (вырадак), выродъ (тое, што і выродокъ), окаянникъ, оканникъ (акаянны чалавек), окаянница (жан. да окаянникъ), окаянный, окаанный, оканный, оканый (у знач. наз. тое, што і окаянникъ).

Назвы асобы паводле адносін да маральных нормаў і звычаяў (парушальнікі). Гэтая група з'яўляецца самай вялікай, таму што парушэнне ўсталяваных звычаяў і маральных нормаў кранала гонар, сумлен-

не чалавека; разбурала традыцыі, выпрацаваныя народам спакон вякоў, і таму з'яўляецца недапушчальным.

1. Агульная назва паняцця “дрэнны чалавек, шкоднік”: безправникъ (чалавек, які паступае незаконна, несправядліва), вредникъ (шкоднік), докучникъ (надакучлівы, назойлівы чалавек).

2. Несумленныя, непаважныя: невстыдливецъ (бессаромнік), невстыдливый (прым. у знач. наз. бессаромнік, нахабнік), негодникъ (нягоднік), негодный (прым. у знач. наз. нягоднік; чалавек ганебных паводзін), негодяй (нягоднік; чалавек ганебных паводзін).

3. Задзіры, буяны; падбухторшчыкі: бийца (задзіра), буй (буян), збой (удалец, зух, буян), зводитель (падманшчык, падбухторшчык), зводникъ (ашуканец, падбухторшчык).

4. Ашуканцы, махляры: ошустъ (ашуканец), подступникъ (падманшчык, ашуканец), подступца (падманшчык, ашуканец), прохира (праныра, ашуканец), прохирца (тое, што і прохира), проходень (прайдзісвет).

5. Гультаі, нядбалыя: гольтяй, гольтай (гультай), гултай, гультай (гультай, вісус, шалапут; нягоднік), гултайство (наз., зб. ад гултай), дармоедъ (дармаед), лежень (лежань, лежабок, чалавек без пэўных заняткаў).

6. Няўдзячныя, пагарджальнікі, зневажальнікі: взгардителка (жанчына, якая пагарджае чым-н. або кім-н.), взгордитель (чалавек, які кім-н. або чым-н. пагарджае), згардитель (зневажальнік), зневажачъ (зневажальнік).

7. Распуснікі: безецникъ (нягоднік, распуснік), безстудница (бессаромніца), бигамъ (дваяшлюбнік), блудникъ (распуснік), блудница (распусніца), блудный (прым. у знач. наз. распуснік).

8. Абжоры, п'яніцы: гортанобесецъ (абжора), жарлокъ, жарлакъ (абжора), жерецъ (той, хто многа есць), жорлачъ (тое, што і жарлокъ), пьяница (п'яніца), многопийца.

Такім чынам, словы дадзенай групы лексікі ўсебакова характарызуюць адмоўныя якасці чалавека. Многія лексемы застаюцца прыналежнасцю старабеларускай літаратурнай мовы: велемовца, гортанобесецъ, обидолюбецъ, многопийца, распретворецъ і інш. Нямала лексем захавалася да нашых дзён у літаратурнай мове (дивакъ, блюзнеръ, несмелый, гультай, негодникъ) або ў гаворках (вырва, жминдакъ, вадца, зводникъ).

**Літаратура**

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А. М. Булыкі. Вып. 1–31. Мінск, 1982–2011.